Сяргей Рублеўскі



...калі і было што вартае ды значнае
ў адлушчаным часе,
дык, мусіць, толькі каханьне...

# А мае вы дзеўчынёшкі...

***Аповеды***

## “№13” і “№14”

Клаўдзя Какоўка колькі апошніх гадоў цераз сілачку жыла з Эдзікам. Па сутнасьці, “сваім”, наканаваным яна яго ніколі і не лічыла. Як толькі ўзрасьлі дзеці, жанчына “перапылала” ў двух ці трох галавакружных раманах... Тым больш, Эдзік ня мог быць “сваім”, калі яны скасавалі шлюб. І ўжо зусім Клаўдзя адчужыніла Эдуарда пасьля сьмерці сьвякровы Леакадзіі Сыктасаўны. Калі што і аб’ядноўвала цяпер былых шлюбнікаў, дык толькі супольная жылплошча, якая зьвядзе падручкі і з самім д’яблам. Кватэра, а яе дамаглася сьвякрова, калі працавала галоўным эканамістам фанернай фабрыкі, была надзіва прасторнай, на тры пакоі, з вялізным доўгім калідорам. Якраз найбольш за калідор і ўпадабала яе Клаўдзя, бо лічыла, што жыцьцё набывае асаблівую вольнасьць менавіта ў

“паўзах”, якія доўжацца ў прамежкавай прасторы. Тады ты больш разьняволены ад якіх-кольвечы турботаў, бо яшчэ “не дайшоў” да іх. Дык ёй і не хацелася разьменьваць такое спрыяльнае жытло. Да таго ж думала, што пасьля вучобы ў Чэхіі, нарэшце, вернецца ў родны горад сын, ажэніцца ды прывядзе ў гэтыя “харомы” нявестку.

Адным словам, Клаўдзя, як магла, цярпела суседства Эдзіка дзеля сына, балазе дачцэ пашчасьціла з сужэнцам, хлопцам увішным і заможным. У душы Эдзік усьцешваўся хоць і такім адчужаным супольніцтвам. Ён быў знакамітым у горадзе мастаком і, нягледзячы на ўсе перажытыя з Клаўдзяй звадкі, усё яшчэ захоўваў у куточку сэрца прыязнасьць да яе. А можа, як мастак проста на ўсё жыцьцё быў замілаваны ейнымі вялізнымі, празрыстымі, як блакіт нябёсаў, вачыма ды зграбненькім, па-антычнаму доўжанькім носікам. Знаёмцы не аднойчы пазнавалі яе рысы ў жаночых партрэтах Эдуарда.

Праўда, цяпер жывапісам ён займаўся куды меней, бо захапіўся мастакоўскай рэчаіснай дзеяй – перформансамі. Жывапіс апошнім часам куплялі неахвотна, а на мастакоўскае вычварэнства ўсё яшчэ быў попыт на Захадзе і адпаведна магчымасьць зарабіць на фестывалі ў якім-небудзь Эдзінбургу ці дзе яшчэ. Усе свае задумы Эдзік спачатку правяраў па рэакцыі тутэйшых людзей, на радзіме: калі яны глядзяць на ягоную дзею няўцямна, як бараны на новыя вароты, значыць – тое, што трэба.

Аднойчы апантаны творца праплыў у труне па Дзьвіне – выструнены, як націнка, з цнатліва сашчэпленымі на грудзях рукамі. З-за плечукоў вытыркаліся зробленыя з пап’е-машэ і абклееныя курыным пер’ем анёльскія крылы. Перформанс называўся “Лету перагарадзілі” і сабраў каля цэнтральнага мосту пару дзясяткаў гарадскіх абібокаў.

Яшчэ адзін запамінальны перформанс Эдзік зладзіў у більярднай. Яго заклеілі ў агромністым папяровым шары пад нумарам трынаццаць, потым з тузін прыгожых, апранутых у міні-спаднічкі, зноў жа з курынага пер’я, дзяўчат пачалі выседжваць гэтае “яйка”, пакуль з яго ня “вылупіўся” ўсьмешлівы пісклявы мастак. Галава Эдзіка была старанна паголеная да шызаватага бляску, а з двух бакоў, на чвэрць ад скроняў чарнела старанна выведзеная лічба “13”. “Пад тым самым імем!” – прагарлаў дурным голасам мастак і дастаў са сваёй раскудлачанай барады тэнісны шарык.

Але галоўны Эдзікаў “перформанс” штотыдзень, а то і часьцей, бачыла Клаўдзя: “вочы па яблыку, барада ўгору”, як казаў пра яго скульптар Іван Кардамонаў. Пасьля дзвюх-трох шклянак партвейну ён завальваўся на канапу ў сваім бакавым пакоі і соладка хроп на ўсю кватэру – трэба было сьпехам зачыняць дзьверы, каб не разьятрыцца ад раздражненьня.

З прычыны слабых заробкаў апошнім часам Эдзік перайшоў выключна на партвейн, кільку ў тамаце і танныя ў сезон малдаўскія баклажаны, якія смажыў з морквай і цыбуляй.

А здараліся дні, што майстра пэндзля і вычварэнскіх дзеяў абыходзіўся якой скарынкай хлеба ды кубкам пастэрызаванага малака. Было, хоць ты да халадзільніка не падыходзь – адчыніш дзьверцы, а там поўна яды, толькі назапашанай Клаўдзяй. Эдзік спачатку саромеўся чапаць ейныя харчы: паглядзіць, паглядзіць ды са шкадобай зачыніць дзьверцы. Асабліва на першай пары, калі ў памяці яшчэ сьвежа згадвалася маці, якая, як магла, спрыяла міру ў сям’і. Але ж голад ня цётка. Аднойчы Эдзік ня вытрымаў і, балазе Клаўдзі не было дома, калі ў чарговы раз адчыніў халадзільнік, дык хуценька намазаў скібку жытнёвага хлеба селядцовым

маслам і зьеў, можа, усяго ў тры кусанкі. Потым азірнуўся на дзьверы, дастаў пакунак селядцовага масла і акуратна падраўняў яго сталовым нажом. Гэта быў пачатак дробных крадзяжоў заўсёды галоднага аматара партвейну. І Клаўдзя не адразу выкрыла злодзея. Наогул пад ісподам яе душы ўсё яшчэ патыхаў прысак спагады да Эдзіка – няхай сабе яна і нагадвала дробную міласьціну. Нялюбы, але ж свойскі, падшчэплены да лёсу дзіцячай будучыняй. Па сутнасьці, Клаўдзі было не шкада якога кавалку куплёнага ці згатаванага, але каб жа ён, зараза, быў шчырым – папрасіў ці проста сказаў, што ўзяў, дык не бяды, а то ўсё праз круцельства, хітрыкі ды ашуканства. Усё мае яе за прасьцяцкую бабу, нібы і не перапынялася даўнейшае жыцьцё.

Аднойчы ўвечары, калі Клаўдзя ладзіла вячэру і адчыніла халадзільнік, каб узяць сьмятану, яна міжволі скасавурылася на круглую, з празрыстага пластыка банку селядцоў, якую купіла ўчора заадно з суседкай Анжэлай. І хутка зразумела, што прыцягнула позірк: селядцы ляжалі ня так, як раней, а былі выкладзеныя марской зоркай, "камялькамі" ў сярэдзіну. Гэта трэба было пастарацца.

"Эдзікава работа, ягоная "прыгажосьць", – жагнула Клаўдзю. Раздражнёная, яна нават забылася на толькі што згатаваную гарбату. Пайшла ў дальні пакой і ўзялася за распачатае крапаньне чарговай шапачкі. А потым рашуча ўзьнялася і пайшла да суседкі, прыхапіўшы з сабой школьную лінейку ўнука. У Анжэлы Клаўдзя несла немаведама што пра тлустасьць і важкасьць івасёў, пра правы пакупніка, пакуль не папрасіла паказаць ёй учарашнюю пакупку ды не памерала даўжыню пары селядцоў. Вярнулася дамоў і пераканалася: так і ёсьць, ейныя на паўтара-два сантыметры карацейшыя. Не надточыш. "Лішкі" пайшлі на закусь. Дык на табе, з правіны зладзіў прыгажосьць... Але ж яна як насьмешка!

Клаўдзя не магла звыкнуцца з такімі, як ёй здавалася, зьдзеклівымі рабункамі былога мужа. Як магла змоўчвала, каб не ператвараць сумесную жылплошчу ў вар'яцкія квадратныя метры, але яе ўжо пакрысе перапаўняла невыноснае раздражненьне.

Увечары, калі самотная Клаўдзя цадзіла скрозь зубы даўно астылую зялёную гарбату, на кухню зайшоў Эдзік, як заўсёды нападпітку, у добрым узрушэньні. Зьбіраўся некуды ад'язджаць з сябрукамі.

– А можна я мінералкі трохі вып'ю? – адчыніў ён халадзільнік.

– Смага сушыць? Солька ў знакі даецца...

– Пігулку запіць трэба! – схлусіў мастак і наліў сабе шклянку "Дарыды".

"Папрасіў, што гэта будзе? Новы крадзёж, мусіць..." – падумала Клаўдзя.

У пятніцу яна, як заззычай, паехала да бацькі ў Шпакоўшчыну. Напакавала сумку крамнымі харчамі, прыхапіла з сабой і бляшанку з селядцамі-недамеркамі. Яны былі ёй ужо папярок горла.

У вёсцы Клаўдзя, як заўсёды, акрыяла душой – нагаварылася з бацькам, надыхалася паветрам роднай хаты, паблукала ў лесе нязводнымі сьцежкамі малалецтва... Нарэшце, сустрэлася з былой аднакласьніцай Яняй, якая, лічы адразу пасьля школы, зьехала на сталае жыцьцё да сваякоў на Палесьсе. Маці Яні з радасьці іхняй сустрэчы ня ведала чым частаваць "дзяўчатак" – наліла поўную місу сьвежавыгнанага мёду, выклала гару праснакоў, дастала са склепу пузатую бутэльку даўнейшага дамашняга віна... А калі Клаўдзя адыходзіла дадому, удружыла ёй пару

дзясяткаў свежых яечак – “куры нясуцца, як ніколі, поўнае рэшата назьбіралася...”

Клаўдзя прыехала дадому запозна ў нядзелю, калі ў горадзе ўжо запалілі ліхтары. Як толькі адчыніла дзьверы ў кватэру, дык адразу зразумела, што перформанс – “вочы па яблыку, барада ўгору” – ужо ў самым разгары. І сьпешна пайшла на кухню. Пачала гатаваць сабе каву і даставаць з дарожнай сумкі пакункі – пер’е і галоўкі цыбулі, гуркі з ліпеньскай лешкі, неўпрыкмет далучаны бацькам слоічак бурштынавага мёду і акуратна складзеныя ім у кашолачку, каб не пабіліся, яйкі, пачастунак Янінай маці. Клаўдзя наважылася пакласьці іх ня ў скрынку ў халадзільніку, а выставіць у гнязьдзечкі на сьпецыяльнай пластыкавай палічцы – балазе месца хопіць. Якраз у гэты момант з Эдзікавага пакою пачуўся скрыгат спружынаў канапы, ён, па ўсяму відаць, няўклюдна варочаўся на другі бок, а потым – раптоўны, пералівісты, з подсьвістам храп. Клаўдзя шчыльна зачыніла дзьверы кухні ды пачала шукаць у шуфлядзе валяр’янку. І тут у руку ёй нечакана патрапіла медычная ліпкая стужка для загойваньня розных драпінаў ды парэзаў. І гэтага было дастаткова, каб у Клаўдзі, не раўнуючы як у Эдзіка, распачаўся творчы сьверб. “Зараз я яму наладжу перформанс. Век помніць будзе!” Яна ўзяла нажнічкі і адрэзала ад скрутка стужкі першы квадрацік. Потым лоўка прыляпіла яго на яйка і алоўкам для броваў зьлёгку напісала на ім “№1”. Менавіта вось так – у двухкосьсі, як назоў якога мастакоўскага твору. І выставіла яйка ў першае гнязьдзечка на халадзільнікавай палічцы. Потым пайшло па парадку і з натхненьнем: “№2”, “№3”, “№4”... Клаўдзя выстаўляла яйкі налепкамі да сьценкі, каб не кідалася ў вочы. Дайшла да “№19” і запынілася: заставалася адно яйка, і яна вырашыла зварыць яго і зьесьці, каб вось так “закусіць” фінал зморнай “творчай” дзеі. Паставіла ваду на газ ды пачала чакаць і спакваля думаць пра свае ўзаемаадносіны з Эдзікам. Пра тое, як гэта нязвыкла, калі па сутнасьці не чужыя людзі, зьядданыя роднай крывёю, раптам раз – і выракаюцца адно аднаго навекі, усё рассыпаецца не на палавінкі, а на аскепачкі, ідзе ў распыл, што і сам Бог не сабярэ да кучы. Напаўненьне душы згубнымі пачуцьцямі – страшная трагедыя. Звыклы сьвет разбураецца, чэзьне, няхай сабе і не наяве, а ў галаве.

Клаўдзя дастала яйка з кіпеню і ў кубачку паставіла пад струмень сьцюдзёнай вады, каб ачахла. Але ёй ужо зусім не хацелася есьці – толькі прачытаць колькі старонак ды аддацца пяшчотнай зморы сну.

Перад тым, як сысьці ў свой дальні кут, яна на ўсялякі выпадак прыхавала зваранае яйка ў мяшэчку крупаў, каб зьесьці яго ў сьняданак, бо ведала, што абуджаны якой начной патрэбай Эдзік не засьне зноў, пакуль не здаволіць свой, непадуладны якой абачлівасьці, неўтаймоўны апетыт. Спрасоньня яму заўсёды здаецца, што яшчэ не закусіў.

На гэты раз, “пакамшаны” жорсткімі спружынамі мастак, устрывожыўся а чацьвёртай гадзіне ночы. Схадзіў у прыбіральню, а потым, як заведзена, прыклымаў на кухню. Адліў з Клаўдзінага тэтра-пакета ў кубачак журавінавага морсу і даліў туды з чайніка вады. Расчыніў балкон, пакурыў і востра адчуў, як засмактала пад лыжачкай. Эдзік зноў адчыніў халадзільнік і на гэты раз упёрся позіркам у палічку з акуратна састаўленымі яйкамі. Пад лыжачкай засмактала яшчэ больш. Мастак хуценька запаліў газ і ў каторы раз заўважыў, што ўначы ён загараецца куды больш ахвотна, паставіў на агонь патэльню і ўзбіў на яе пару яек: “Жыва будзе, гэта ж не куплёныя, а, як кажуць у вёсцы, “палучаныя”, – усьміхнуўся

творца жывому слову, пачутаму ў свой час у той жа Шпакоўшчыне. Неўзабаве ён выклаў яечню на талерку і ўзяўся прыбіраць стол. Дык са зьдзіўленьнем убачыў, як ён лоўка, акурат напалам разьбіў нажом яечныя шкарлупкі. І зьдзівіўся ячшэ больш, калі заўважыў, што яны злучаны паміж сабою, не раўнуючы як весьнічкі са слупом. На якое імгненьне Эдзік згубіў апетыт, калі ўбачыў квадрацікі медычнай стужкі з адпаведнымі надпісамі алоўкам. Ён праверыў усе яйкі на палічцы і пакруціў іх нумарамі наперад. Перформанс ды і толькі! Але мастаку было не да жартаў. Ён без былой ахвоты зьеў яечню ды зашыўся ў сваю бярлогу. Сон зноў прыгарнуў яго і павёў сваімі дзівоснымі сцяжынамі.

...І тут да Эдзіка прыйшла Клаўдзя. Яна была ў вяночку з жоўтых садовых рамонкаў, які вольна ляжаў на высьветленых хіміяй валасах, усё адно як на запечаным яйкавым бялку. Клаўдзя гарэзьліва ўсьміхнулася, рупненька нахілілася і сарвала з падлогі, нібы з луга, пухнаты дзьмухавец, паднесла яго да вуснаў і выдыхнула паветра. Эдзік тут жа адчуў, як па яго нагах казытліва каўтанулася асьвяжальная хваля. Але не пасьпеў ён раскунежыцца ў дзьмухаўцовым подыху, як вочы Клаўдзі зажаўцелі нядобрым вядзьмарскім сьвятлом, і ў яе руцэ зьявіўся прыбор для выпальваньня, добра вядомы Эдзіку яшчэ з пары выкладаньня ў школе выяўленчага мастацтва. Танюткі дроцік у гэтым прыборы на вачах напаліўся да жагнальнай чырвані, але сонны відзёж раптам патануў у густой смалістай цемры. А потым гэтую цемру, нібы пад старым, крытым драніцай дахам пуні, прарэзаў калючы праменьчык. Праз якое імгненьне Эдзік адчуў, што жмуток сьвятла надзіва балюча пабег, нібы імклівы павучок, па ягоным целе. І нават не жмуток сьвятла, а распалены да павеўнага подыху гарачыні вугельчык, і нават не вугельчык, а сагнуты дужкай танюткі дроцік... Эдзік ня столькі ўбачыў, колькі адчуў, што ён, гэты дроцік, гэты боль, павольна апускаецца ўніз, пакідаючы за сабой танюткі дзіравы сьлед, нібы які вучань выпісваў “№1”. А потым пякучае джала пайшло па дузе, на імгненьне прыпынілася – цела працяў ігольны боль, ды зноў пайшло ўправа, зноў па дузе... Як толькі мастак зразумеў, што д’яблава рука выводзіць лічбу 3, ён расплюшчыў вочы і агледзеў пакой – анікога. Эдзіка калаціла дрыжака і ён зразумеў, што боль, які цягне ў глыбіню прадоньня зьвіўся ў ягоным мужчынскім мяшэчку пякучым надпісам “№13” і ўсё яшчэ не адпускае, са страшнага сну вытачыўся ў яву. “Можа, давядзецца ператрываць і “№14”, у левы бок цяпер больш аддае...” – падумаў устрывожаны мастак і выпрастаўся на ложку. Боль не адпускаў. Эдзік павярнуўся на правы бок, падкурчыў пад сябе ногі, прыняў позу эмбрыёна і пачуў, як ляпнулі дзьверы – Клаўдзя сышла на работу. Мастак баяўся заснуць нанова, дык ўслухоўваўся ў далёкую гаману вуліцы і думаў, думаў пра ўсё на сьвеце – толькі б хоць крыху адпрэчыцца ад болю. Варта было згадаць яму Клаўдзю, дык, здавалася, пякучае джала болю куды ямчэй угрызалася ў цела.

“Ну як жа можна такое трываць: ты ўсяго толькі дадатак да ейнага лёсу, як у свой час дадатак да часопісу “Работніца і сялянка”. Вось і ўсё тваё прызначэньне – выключна дзеля ейнай уцехі... А сама? І ня думала калі прыхінацца душой да маёй творчасьці, да самага галоўнага, што, па сутнасьці зьяўляецца Божай мецінкай. Ёй усё адно ці я кулі цягаю, ці пэндзлем карціну выштукоўваю. Крапіўнае семя! Дадуць адзін разок паспытаць яблыка спакусы, і ўсё на гэтым, і ня думай пра які наедак, ледзь прыгубіў келіх асалоды – і досыць. Вось і сыходзіш у адзіноту, у немату, у адчужанасьць...”

Эдзік прыслухаўся да свайго цела: боль пачаў пакрысе суціхаць, глухнуць, як зьнясілены зацяжны дождж на гоньце. Небарака зноў выпрастаў ногі, лёг на сьпіну.

“Гэта ж трэба так пасьмяяцца з маёй перформанснай дзеі: а было не чапаць чужое! Што я, аб’ем яе? – доўжыў свае нудотныя развагі Эдзік. Але ён пачаў здагадвацца, што ня з Клаўдзінай шкадлівасьці, а больш з ягонага нахабства завязаўся вузельчык такіх прыкрых пачуцьцяў ды нікчэмных перажываньняў. – Пражыць столькі гадоў разам і так адчужыніцца, так адмежавацца...”

Эдуарду захацелася закурыць і ён, балазе боль амаль цалкам аціх, сеў на ложку – і нібы атрос свае зблытаныя думкі. Выйшаў на балкон і пачаў пыхкаць сваёй улюбёнай, з вішнёвага дрэва люлькай.

“А, можа, гэта мне які знак звышай? Можа, не мая гэта справа займацца перформансамі, а трэба вярнуцца да жывапісу? Дарма што нішчымна, мастацтву ж трэба служыць не за грошы!” – і Эдуард праясьніўся ад гэтай просьценькай высновы, як ад шчасьлівага адкрыцьця. І тут жа дараваў сабе ляноту, частыя п’янкі, і, вядома, дробныя крадзяжы з халадзільніка. А Клаўдзі – ейнае выкрывальніцкае вычварэнства. Такі знак!

Эдзік пайшоў на кухню і адшукаў там сярод здавалася б колькі разоў сцэджаных лекавых настоек чайную лыжку вадкасьці з каранёў дзівасілу і акрапіў горла. Потым імкліва пайшоў у кладоўку і дастаў адтуль недапісаны партрэт Клаўдзі, апошнюю сваю работу ў жывапісе. Звыкла заслаў падлогу ў сваім пакоі поліэтыленавай плёнкай і паставіў падрамнік на мальберт. Расшукаў па ўсіх кутках фарбы – многія з іх яшчэ не зусім засохлі, выціснуў іх на палітру. Найперш памаранчавыя, вогненных адценьняў.

## ВЯСЕЛЬЛЕ Ў “ЖУРАВІНЦЫ”

Асьцерагаюся пісаць рэчаісную праўду – людзі слаба вераць. А калі расхінаю разлогі майго ўяўленьня, дык, наадварот, цалкам перакананы, што так і было. “Ці ты плаваў па Касьпійскім моры?” – пытаюцца. Або: “Калі гэта цябе ў Стакгольм занесла, ды яшчэ на ўручэньне Нобелеўскай прэміі в’етнамскаму пісьменьніку...” “У сьнежні, вядома”, – адказваю, патупіўшы вочы. А сам згадваю, як распытваў дасьведчанага чалавека, якое ў шведскай сталіцы надвор’е гэтай парой, ці ідуць дажджы. Пра каралеўскае ўшанаваньне нейкага там в’етнамца і казаць няма чаго.

Але ж зрэдчасу трэба пісаць і праўду.

Напачатку 80-х гадоў мінулага стагоддзя мая пляменьніца Рыта вырашыла выйсьці замуж, а верхаводы партыі гэтым часам вырашылі змагацца з “зялёным зьмеем”, які абвіў сваім бясконцым целам увесь савецкі народ. Горшага супадзеньня цяжка было прыдумаць. Па сутнасьці, была ўведзеная дзяржаўная забарона нават на слабую хмельную весялосьць. Мы, а я тады працаваў у раённай газеце, шмат пісалі пра гэта. Памятаю, адзін мой калега займеў факцік у міліцыі: брыгада мантажнікаў заводу паравых катлоў пасьля работы ўдумала адзначыць дзень народзінаў свайго слесара проста ў цэху, у яго побытавым закавулку. Зладзілі шчытавы стол – як доўгія лебядзіныя шыі тырчэлі над ім бліскучыя бутэлькі шампанскага. Прыгожа ўсё выглядала. Брыгадны аматар фотасправы зрабіў здымкі на памяць. Але, як высьветлілася праз якія паўгадзіны, – на горкую. Дзяжурны дабрадзей загадзя патэлефанаваў “куды

трэба", дык і наляцела міліцыя. Склалі пратакол, забралі фотаплёнку як красамоўны доказ хмельнага злачынства. А потым дзеля галоснасьці перадалі матэрыялы ў прэсу. І нават з фотакарткамі – сьпецыяльна зрабілі з адабранай плёнкі. Адна з іх была ў найлепшым ракурсе: доўгі стол і вясёлая кампанія цалкам патрапілі ў кадр, да апошняй бутэлькі. А мой зьедлівы цынічны калега заўважыў, што тарэц стала знаходзіцца акурат пад вялізным, прымацаваным да сьцяны рубільнікам. Дык балагол нязмушана назваў сваю насьмешлівую зацемку "Гулянка пад рубільнікам".

Казалі, што муж адной жанчыны, якая апынулася на фотакартцы, прыраўнаваў яе да майстра брыгады: маўляў, надта шчыльна прыхінулася, ды так прыязна ўсьміхаецца начальнічку... Тым вечарам узьюшаны раўнівец ганяў бедную жанчыну па кутах хаты, ёй нават давялося зьбягаць упрочкі да маці. Урэшце рэшт у сям'і ўсё наладзілася, але калісьці паважаную газету паштальёны больш ніколі не прыносілі на гэты адрас.

Калі ўжо строгія ахоўнікі цьвярозага ладу жыцьця завіталі ў заводскі цэх, дык што ўжо і казаць пра кафэ "Журавінку", дзе мая цётка Геня ладзілася са сватамі спраўляць вясельле... Вядома ж, не абмінуць. Геня нарадзілася яшчэ за Сталінам і мела ў душы колькі столак сацыяльнай перасьцярогі. Аднойчы яна ўдзельнічала ў камсамольскім вясельлі і была ўражаная патрыятызмам узаконенага каханьня. І вось увайшло ў моду вясельле безалкагольнае. Як правільна зразумела мая цётка, заснавана яно было на біялагічным – праз абмен рэчываў – патрыятызме. Было ж няўцямна, з якой радзімай, з якім этнічным космасам ён зьнітаваны. З беларускім? – дык ані блізка. У нас жа гуляць, дык гуляць! А што на цьвярозую галаву? Ні пабіцца, ні памірыцца...

Геня пачала рыхтавацца да вясельля з таго, што закупіла чатыры скрынкі "Крэм-соды" і "Дзюшэсу". Хаця, не. Спачатку яна зьезьдзіла ў нашую радавую вёскую Сёмая Саладуха і дамовілася з дзедам Петраком, самым спрактыкаваным майстрам хлебных напояў, выгнаць ёй два судавікі палкага першаку, як кажуць, з надтом, з разьлікам на апахмелку. Пятрок, як і ўсе такія хвацкія дзяды, быў надзвычай заняты, але Гені не адмовіў, перапусьціў наперад у чарзе – трохі ж сваячка ды і справа неадкладная – вясельле! Адно папрасіў прывезьці дражджэй і марганцоўкі.

Вось цяпер якраз і пара згадаць пра тыя чатыры скрынкі "Крэм-соды" і "Дзюшэсу". Цётка акуратна адкаркавала бутэлькі і пераліла напоі ў вялізныя шкляныя ёмістасьці. А потым усё ж – у куды меншыя: збаялася, што закіснуць напоі... Вырашыла да пары паставіць іх у свой і суседак Ліды і Валі халадзільнікі. На стол гэтую запіўку вырашылі падаваць у прыгожых гранёных графінах. Але яе аказалася замнога, і колькі дзён цётка частавала ласункавай вадою ўсю знаёмую дзятву пад'езду, за што яе надта палюбілі.

Калі паселі за вясельны стол, дык я ў думках адзначыў: вось як дзіўна атрымліваецца: толькі і робім, што "запіваем" – з бутэлек з-пад "Крэм-соды" і "Дзюшэсу", з цяжкіх графінаў... Насамрэч, у бутэльках была Петракова самагонка, ну і, вядома, пералітая ў іх крамная. Усё пад цнатлівымі безалкагольнымі налёпкамі. Крыху пазьней, калі госьці весела загулі і рассмакавалі ўсё, перад мужчынамі ўзьнікла праблема: як пазначыць ды не забыць: дзе Петракова "сьляза", а дзе заводскі прадукт. Гаспадыня ж не даўмелася падзяліць іх: адзін гарачы напой, напрыклад, – у бутэлькі з-пад "Крэм-соды", другі – з-пад "Дзюшэсу". Усё было пераблытана, дык пераборлівыя піткі,

якія выбралі “сельскагаспадарчы напой”, спачатку прынюхваліся, спрабавалі, потым прыкмячалі, а то і пазначалі якой мецінкай бутэлькі.

Тое, што вясельле спраўляецца ў самы разгар барацьбы за правядзеньне найцьвеThere разейшай лініі партыі, вядома ж, мелі на ўвазе ўсе, але гулялі яшчэ больш зацята. З кіраўніцтвам кафэ была дамоўленасьць наконт напояў, прадуктаў ды іншага. Вядома, цётка Геня каму трэба дала на лапу, каго трэба “падмазала”. Але, як гэта часта бывае, ня ўсе здаволіліся, у прыватнасьці, афіцыянткі. І напачатку вясельнай бяседы адна з іх зрабіла выгляд, што анічога ня ведае пра пэўную тэатралізаванасьць дзеі ды поўную згоду ейных галоўных рэжысёраў. Прыбіраючы на ўскрайку стала скарыстаны посуд, яна імклівымі рукамі падхапіла і колькі бутэлек крэм-соды і дзюшэсу: маўляў, недапіткі толькі замінаюць, загрувашчваюць стол. Афіцыянтка скарысталася момантам, калі грамада выйшла патаньчыць ды перакурыць. Але ўсё адно гэтая зламысная дзея не засталася незаўважанай. Тым больш, што прыхапіла яна якраз Петракову “сьлязу”. Гэта было для яе неабачліва: ня ведала, зараза, з кім мае справу. Я, прызнацца, і сам толкам ня ведаў. Ну казалі, што Рыцін Раман сёлета заканчвае вайсковае вучылішча, а якое, што за сьпецыяльнасьць – пра гэта ні слова. Як высьветлілася, будзе афіцэрам камітэту дзяржаўнай бясьпекі.

На вясельле Раман запрасіў, лічы, усю сваю групу. Я адразу прыкмеціў гэтых акуратна падраўняных у цырульні, апранутых у строгія строі, прыязных, усьмешлівых, заўсёды гатовых да размовы хлопцаў. А былі яны з усіх куткоў вялізнай краіны. Аднаго, помню, звалі Абдула, як уладальніка гарэма з кінакарціны “Белае сонца пустэльні”. Чаму зьдзіўляцца: на тую пару ў Беларусі многае рабілася ва “ўсесаюзным маштабе” – ад трактараў да навучаньня такіх хвацкіх сьпецыялістаў.

Хлопцы невядома чым, але былі падобныя адзін да аднаго. Можа, някідкасьцю аблічча – па тварах здавалася, што ўсе яны браты... Кожны з іх мог скласьці пару з нашай Рытуляй, але я адганяў ад сябе гэтую прыкрую думку.

А яшчэ неўзабаве заўважыў, што хлопцы, я іх ужо абазваў для сябе “шпіёнамі”, надта лёгка арганізоўваюцца, нібыта дзеля выкананьня якой вялікай пажыцьцёвай задачы пад кіраўніцтвам неадпрэчнага і ў той жа час нябачнага, вельмі ўплывовага верхаводы. Пасьля таго, як афіцыянтка ўчыніла па стале свой вераломны рэйд, ад купкі “шпіёнаў”, а яны стаялі зводдаль, пры наступным яе насоўваньні аддзяліўся адзін таварыш, шпарка наблізіўся і, узяўшы спрытнюгу за руку, адвёў яе ўбок, запыніў на колькі хвілінак ды штосьці працадзіў скрозь зубы. Не чуваць было што, але добра бачылася, як афіцыянтка ўвобміг спалатнела і ўжо на ватных нагах пайшла далей са сваім падносам.

Калі мы выходзілі на другі перапынак, каб трохі ачомацца ад шчодрай яды і пітва, я міжволі патурбаваўся і выказаў трывогу свайму суседу-“шпіёну”: маўляў, стол без нагляду пакідаем, а могуць жа й яшчэ які “набег” учыніць... “Не хвалюйцеся, – сказаў мне ўсьмешлівы маладзён, – усё пад кантролем! Вунь, бачыце?” – і паказаў на свайго таварыша, які нязрушна сядзеў за сталом, поркаючы відэльцам салату з гародніны.

Мяне пачала разьбіраць усё большая і большая цікавасьць да гэтых хлопцаў. Наогул жаданьне заняцца шпіёнскай справай, як мне здаецца, не пакідае мужчынаў з малалецтва і, мусіць, да старасьці.

Каб далучыцца да іх кампаніі падчас чарговага перакуру, я, хоць і меў

яшчэ добра напоўнены пачак, папрасіў пазычыць адну цыгарэтку – маўляў, з лягчэйшым тытунём пажадана, у горле ўжо дзярэ...

– А ў мяне адзін знаёмы журналіст ёсьць, дык ён люльку паліць... – між іншым сказаў хударлявы “шпіён” і падторкнуў мне агеньчык запальніцы.

І гэта трэба было разумець так: вось бачыш, ты намі толькі зацікавіўся, а мы ўжо пра цябе тое-сёе ведаем! Ухвальна, што маеш клопат аб шчодрасьці нашага супольнага стала, калі ласка, у нашую дзейную гуртоўню. Я з ахвотай запаліў, нібы ўлагоджаны індзеец з другога племя.

Так мы, заядлыя смактуны тытуню, штораз гуртаваліся ў паўзах, здавалася, бясконцай вясельнай дзеі.

“Шпіёны” з ахвотай прымалі ўсіх у сваё неадчужанае, прыяцельскае кола.

Зусім лёгка ўвайшоў у яго і Піліп Конаўка, стары дзядок з радні Генінага мужа. Ён нязводна курыў толькі “Беламор”, а прыпальваў выключна сярнічкамі. Калі курцы зьбіраліся разам, Піліп з ахвотай як мага доўга трымаў у спрытна сашчэпленых руках агеньчык, запрашаючы прыпальваць. Дужа паслужліва.

– А мне вашае дзела знаёмае, – распачаў стары чарговую гаворку. – Я ж ваяваў, хоць і малады быў. У партызанах. Вялікае стварылася злучэньне мсьціўцаў. Дзіва што дзеля парадку ды нагляду з Вялікай зямлі да нас быў прысланы сьмершавец, капітан. У форме ён перад байцамі не выстаўляўся.

Піліп зрабіў глыбокую зацяжку і агледзеў курцоў, каб пераканацца, што слухаюць.

– Ага, такое дзела, значыць. І прыкмеціў той Фёдаравіч мяне, ня ведаю, чым спадабаўся, але ўзяў да сябе, дзеля выкананьня розных шараговых даручэньняў. Талковы чалавек быў. Якога затоенага ворага ўмомант выкрые, а нязломна зацятага дык і шлёпне з пісталету. Чалавек жа што мушына вяртлявая... Да... – задуменна заключыў былы партызан і наважыўся доўжыць свой расповед, тым больш што ўсе слухалі яго з ахвотай.

– А наш атрад быў самы вялікі ў злучэньні. Жылі і ваявалі напоўніцу. Усё мелі, нават сваю друкарскую машыну, “амерыканку”. І пісакі свае былі, – пры гэтым Піліп даволі строга зірнуў на мяне. – І нават паэта свой. Да... А тады ў яго і пасьлядоўнікі зьявіліся. Як здурнелі хлопцы, ці шал які на іх напаў: пачалі складаць у радочкі слоўцы. І ўсё больш па-беларуску, як майстра Анатоль. Выціснуць з сябе пару радкоў, і бягуць да яго: “Толік, ну як?!” Блазьнюкі! Тут ваяваць трэба, а яны з пісанай торбай носяцца. Дык і вылезла тое бокам. З партызанскага друкарскага варштату. Надрукавалі невядома якія мальцы на аркушыку невядома чый вершык: “Я не страчаў такога штаба, Дзе б самагонкі не было, Дзе б...”... Ну вы ж, мусіць, ведаеце гэты сьцішок... – і Піліпок паглядзеў на мяне.

Я хітнуў галавой і сказаў:

– Ведаем, а калі хто ня ведае, потым раскажу.

– Складна напісана, але ж брахліва! Што і казаць, шкоднае было сачыніцельства для той пары, – дзядок падпаліў патухлую папіроску. – Дык Фёдаравіч адразу падумаў на галоўнага вершаплёта, на Анатоля. Выклікаў яго ў зямлянку, пасадзіў насупраць сябе за столік, наліў шкляначку сьпірту: “Пі!” і даў пачытаць друкаваны аркушык. Праваруч ляжаў пісталет.

Трэба сказаць, што гэты вершык добра хадзіў па руках партызанаў, амаль

кожнаму быў знаёмы – калі не прачытаны, дык пераказаны. Анатоль з ахвотай выпіў, захакаўся, сьпешна закусіў рукавом і зашыўся вачыма ў друкаванку. Як па смале, пацяклі гнятавыя хвілінкі. “Ну!” – ня вытрымаў Фёдаравіч. У адказ – маўчаньне. Маўчаньне, а тады раптам, выбухова: “Што за мурня?! Хто гэта мог напісаць?!” І больш ні слова. Толькі закінуў голаў ды вытрас ў рот са шклянкі колькі кропляў сьпірту. “Хай сабе, – сказаў Фёдаравіч. – Ідзі. Каб быў ты – на месцы ўлажыў бы”. А калі Анатоль выйшаў, у мой бок прамовіў: “Паверыў яму. Як Станіслаўскі. А ты паверыў бы, Пілiпок?” “Паверыў бы, Фёдаравіч”, – сьпешна і як мага больш лагодна адказаў я, хоць і зусім ня ведаў, хто такі Станіслаўскі. А вы паверылі б? – абвёў дзядуля позіркам “шпіёнаў”. – Іншым разам трэба верыць...

І тут тамада ў чарговы раз запрасіў гасьцей за стол. Калі ўвайшлі ў залу, я заўважыў, што пару хлопцаў зноў невылазна сядзелі на сваіх месцах. Толькі ня тыя, што ў папярэдні перапынак. “Ці яны дзяжурства якое па графіку наладзілі? І калі згаварыліся? Нічога ж не заўважыш. Можа, знакі якія адзін аднаму падаюць?” Але наўрад ці каго яшчэ з гасьцей займалі такія высочваньні. Яны гарлалі “горка!”, з задавальненьнем выпівалі, таньчылі, весяліліся і радаваліся за маладых. Доўжылася спакон веку ўсталяваная завядзёнка, якая ніколі не надакучыць нашым людзям. І надышла пара, калі дружкі жаніха ўзахвоціліся выкрасьці нявесту, каб хоць так далучыцца да аднаасобніцкага надзелу жыцьцёвай радасьці Рамана. І тут зноў мне адкрыліся нязнаныя з гэтай нагоды манёўры і жарсьці. Раман прадчуваў, што таварышы задумалі крадзёж, і не адпускаў Рыту і на хвілінку, ня толькі трымаў за руку, але і шчыльніўся да яе ўсім целам, каб і вадой нельга было разьліць. Апроч таго, ён перамовіўся з самымі даверанымі сябрамі і папрасіў іх пакруціцца, павіжаваць ды выведаць намеры хітрых жартаўнікоў-зламысьнікаў. Па ўсім было відаць, у крайнім выпадку мне, што над імі верхаводзіць Абдула. Ён прыхінаўся то да адной, то да другой купкі курсантаў, аб нечым перашэптваўся, гуртаваў іх, усё адно, як капітан хакейнай каманды перад рашаючай гульнёй. Хутка Раман даведаўся, што Абдула задумаў заманіць нявесту на кухню і там заняволіць яе, а дзеля гэтага ўчыніць якую-небудзь “няштатную сітуацыю” – напрыклад, адключыць на пару хвілінаў электрычнасьць, каб аслабіць напружаную ўвагу жаніха, перавесьці яе на што іншае. І тут мне раптам падалося, што ўсе гэтыя забаўкі маладзёнаў ня столькі тычацца вясельля, колькі прафесійнай дзейнасьці гэтых амаль ужо навасьпечаных афіцэраў. Што і наогул гэта аніякае не вясельле, а ўсяго толькі практычныя заняткі курсантаў-выпускнікоў. Толькі прысутнасьць бацькоў Рамана разьвейвала гэтае прыкрае ўражаньне. Дык я зноў і зноў пазіраў у іх бок і нават прапанаваў выпіць у іх гонар, у знак падзякі за ўзгадаваньне такога ўдалага сына. І хоць гэта былі шчырыя словы, мне здалося, што яны, як дажджавая вада сьцякаюць у забыцьцё па жолабах абыякавасьці. І наогул ва ўсім вясельлі, у ягоным зладжаным харале скрозь уплецена фальшывая нота. А найперш у тым, што палкі пяршак, які старанна выгнаў Пятрок, быў так па-вычварэнску пападзены на гулянку ў бутэльках, якія нагадвалі непаўторную радасьць маленства. Міжволі згадвалася, як у свой час кожная бурбалачка, абуджаная ў “Крэм-содзе” і падхопленая маімі прагнымі доўгімі глыкамі, весела калола маё паднябеньне... Цяпер здавалася, што тыя бурбалкі навек ачахлі менавіта ў гэтым Петраковым гаркоцьці.

Я наліў сабе з графіну, але гэта быў “Дзюшэс”, прытым даўно выстая-

ны, бяз газавага бурбуленьня. Мне стала млосна, і я выйшаў на паветра, захацелася пабыць аднаму, воддаль ад гаманы выпаліць цыгарэтку. Але на лавачцы ўжо сядзеў са сваёй акуратна пакамшанай папіроскай дзед Піліп.

– Я не страчаў такога штаба... – ўсьмешліва загаварыў з ветэранам шпіёнскага фронту. – Іванавіч, а, калі не сакрэт, “узяў сваё пасьля вайны”, як у тым вершыку казалася?

– Няхай сабе маладзёнчыкі гуляюць... – усутык, але млява адказаў мне дзядуля.

Нашыя адзіноты не прыхінуліся адна да адной.

***

Гадкі праз тры Раман і Рыта ня вытрымалі шчыльнасьці сужэнскай повязі і скасавалі шлюб. Але захавалі добрыя адносіны, іншы раз сустракаліся і разам вырашалі якія побытавыя праблемы. Згадвалі Раманавых сябрукоў, актыўных чыньнікаў таго незабыўнага вясельля. Раман пра іх шмат ведаў: “шпіёнская” повязь, бывае, нават больш трывалай, чым сужэнская. Яна не разарвалася нават тады, калі разваліўся на пятнаццаць нацыянальных частак Савецкі Саюз. Нашы людзі моцна пераҗывалі гэты геапалітычны калапс (“Такую страну развалілі”), але Рытуля – зусім трохі. Адгукнуўся Абдула, нават прыехаў пагасьціць у Беларусі. Пагасьціў – і зьвёз з сабой нашую прыгажуню. Да таго часу на радзіме Абдулы мужчынам ужо дазволілі раскашавацца, як катам на сьмятане, – мець чатыры(!) законныя жонкі. Рыта стала трэцяй. Але толькі па часе рэгістрацыі шлюбу. Насамрэч яна ва ўсім пераўзыходзіла сваіх, як гэта тут сказаць... каляжанак, ці што – і розумам, і прыгажосьцю, і прыхільнасьцю клапатлівага мужа.

### *ПА КРОПЕЛЬЦЫ...*

Марылю Шчодра падсілкоўвалі праз кропельніцу. Ня тое што яна зусім заняпала, проста сэрца трохі занаравілася, неўпапад пачало іншым разам тахкаць, дык ейны каханак, урач паліклінікі, і змусіў падлячыцца на дзённым стацыянары. Перабоі ў рабоце Марылінага сэрца ён адчуў падчас іх блізкасьці, калі, зьнясілены, затуліў голаў пад паху жаданай, прыторкнуўся да яе, як хлапчук.

...Кропелькі жыватворнай вадкасьці ў празрыстым пакуначку аднастайна сьцякалі адна за адной, і жанчына мімволі ўзялася іх лічыць, пакуль не надакучыла. Было сумна. Яна век свой не лекавалася, і гэтая працэдура падалася даволі прыкрай. Марыля агледзела ўсе сьцены, столь пакою, каб зачапіцца позіркам хоць за якое плямца ці бугарок і разглядаць іх, як навіну. Але ўсё было раўнюткім і чысьцюткім, нібы ў геаметрычным сьне. І хворая прымружыла вейкі. А калі праз колькі хвілінаў прачнулася, дык у куце пад стольлю ўбачыла пухнатага чмяля, які, ачмурэлы ад першай веснавой цеплыні, заляцеў у пакой праз адчыненую фортку. Марыля пачала ўтрапёна назіраць, як жамярына няўклюдна абведвае незнаёмы прытулак. Жанчына і думаць забылася пра кропельніцу, гатова была глядзець пад столь бясконца доўга. Але раптам дзьверы гучна адчыніліся, і ў пакой увайшоў каханак: шпарка – крысоўі халата расхінутыя, акуляры вісяць на ланцужку на шыі, у руцэ блакноцік і асадка...

– На што скардзіцеся, хворая?

– На самоту... – у тон яму адказала Марыля. – Ложак без цябе вузкі...

Але далей яна не змагла сказаць і слова. Мікола, так звалі каханка, азірнуўся на дзьверы і хуценька прыклаўся да сасьмяглых Марыліных вуснаў.

– Усё будзе нармальна, – сказаў ён на разьвітаньне, бо трэба было сьпешна ісьці на прыём пацыентаў. Ён было ўжо адчыніў дзьверы, але раптам вярнуўся, зноў прысеў на ложак, падтачыў руку пад лёгкую накрыўку і пагладзіў Марылю па жываце. Яна ўстрапянулася і вольнай рукой памкнулася затрымаць Міколаву пяшчоту, але не пасьпела, каханак разьвітальна цмокнуў яе ў далоньку і сышоў. Марыля звыкла, як заўсёды ў такіх выпадках, спахмурнела. І цяпер ёй заманулася паглядзець на кропельніцу: нескарыстаных лекаў, на яе радасьць, заставалася ўжо зусім мала.

«І што тыя кропелькі, калі ў адным яго дотыку столькі абуджальнай сілы, колькі ва ўсім гэтым медычным пакунку...» – падумала Марыля.

І нечакана абрынулася, нібы з адчаю, у сон.

Прачнулася яна ад ужо добра забытага з мінулага лета зумканьня. Чмель, які набраўся сілы ў пакойнай цеплыні, цяпер, прагнучы волі, адчайна біўся ў шыбіну. І Марылі захацелася ўстаць з ложку, каб хусьцінкай ці чым яшчэ скіраваць яго ў фортку. Яна глянула на кропельніцу і жахнулася: «А Божачкі, лекаў грамулечка, зараз сыдуць і засмокчуць за сабой паветраны пульхірок. А гэта ж сьмерць – сэрца разарвецца...” Марылі стала вусьцішна, і вольнай рукой яна паправіла расхінутыя на падушцы кудлы, нібыта момант вымагаў асаблівай прыгажосьці. І тут жа адчула, як павольны халадок ад ступакоў пакрысе папоўз уверх па нагах. Цяпер яна міжволі глядзела толькі на кропельніцу, хоць было зусім моташна бачыць, як разам з празрыстай вадкасьцю пакрысе незваротна сыходзіць ейнае жыцьцё... Таксама празрыстае, як і няма яго. Жанчына была гатова ляжаць пад гэтай кропельніцай хоць да ночы, хоць суткі ці больш, толькі б не скончаліся насамрэч выратавальныя лекі. Няхай сабе з заплюшчанымі вачыма, без якога-небудзь сузіраньня, у нудоце, прыкрасьці...

Марыля міжволі і заплюшчыла вочы, але тут жа спахапілася, прыўзьняла галаву: а Божачкі, што ж гэта рабіць?!

Самой дастаць з вены іголку? Усё адно памрэш – толькі ад страху, падумала далікатная небарака. Ды і як гэта адной рукой? Потым кроў не супыніш... А медсястра, мусіць, зусім забылася, што ставіла кропельніцу. Ці гарбату п’е, з сяброўкамі лясы точыць...

І Мікола ня выратуе. Больш ня зойдзе, бо да вечару заняты з хворымі – не дыхнуць...

Заставалася адно: узьнімаць гвалт, крычаць паратунку. Але гэта для далікатнай Марылі было зусім непрымальным. Зараўсьці немачкі, як зьвер, яшчэ з адчаю і сьлязьмі заліцца: а ратуйце мяне, людцы? Гэта мог бы зрабіць хіба што зусім інакшы чалавек. А Марылі было няёмка, сорамна так адчайна заяўляць пра сябе...

І не ўпершыню так. Гады са тры таму, калі яны з Міколам адпачывалі на марскім узьбярэжжы, адвячоркам адбыўся такі выпадак. Каханак загуляўся са знаёмцам у шахматы, а Марылька вырашыла паплаваць. І захапілася. Балазе ўсё спрыяла. Пяшчотнае няяркае сонейка, вятрыска з узьбярэжжа – хвалі гушкаюць, як на сон, ды падштурхоўваюць уперад – плыві хоць да небакраю. І заплыла, бестурботная, на такую далечыню,

што нутром адчула: пара вяртацца. А калі павярнула ў бок берагу, хвалі, натуральна, ужо перасталі быць спадарожнікамі. Пачалі залiваць твар – толькі б ухапіць ротам паветра... Да таго ж, здавалася, прыкметна ўзрасьлі. Наглыталася вады ня надта спрактыкаваная плаўчыха, боўтаецца на адным месцы, толькі б на паверхні ўтрымацца... А сіла сыходзіць. Крычаць паратунку трэба, Міколу клікаць, выратавальнікаў на лодцы, а дух заняло і зноў жа – няёмка... Добра, што паблізу апынуўся спрытны плывец, убачыў небараку, дапамог дастацца да берагу. Па сутнасьці, выратаваў.

Праўда, потым, асабліва калі Марыля была адна, запыняў ды запыняў яе ў гатэлі і ўсё дапытваўся: «А можа, вы тады надумалі назаўсёды застацца ў моры, ды я перашкодзіў?..»

«Ні ў якім разе!» – рашуча адказвала жанчына, маўляў, «выратавальны круг» больш не патрэбны, і такім чынам, як ёй здавалася, астуджвала своеасаблівыя заляцанкі спартоўца.

Але цяпер, у палаце, Марыля ня ўспомніла пра той прыкры выпадак: з кожнай новай нагодай сьмерць сьцірае з памяці ўсе свае мінулыя захады. А да таго ж апошняя кропля лекаў ужо абрынулася ў бездань, і Марыля... падрыхтавалася да немінучай сустрэчы з касавокай. Абмяклая, стомленая, яна ляжала на мулкім ложку, нібы пасьля неўтаймоўных любошчаў з каханым, і думаць забылася пра кропельніцу. І пра што ўсё на сьвеце. Жанчыне раптам захацелася паслухаць, як грукае ейнае сэрца, але яго не было чуваць. Спустошаная няпэўнасьцю, яна зірнула ў акно: з ложку было відно толькі хмарнае неба ды вершаліны маладых дрэваў. Марыля падклала пад галаў руку, каб хоць на вяршок узвысіцца над падваконьнем, і зводдаль убачыла людзей, якія шпацыравалі ў скверыку, пачала назіраць, у што яны апранутыя, як рухаюцца, чым занятыя іх рукі... Нібыта гэта было зусім новае, ніколі ня бачанае відовішча. Калі ў “кадры” шыбіны затрымліваліся на колькі хвілінаў адны і тыя ж людзі, Марыля пераводзіла позірк на гаротнага чмяля, які зьнясілена супакоіўся на ніжнім бруску рамы. Гэта адбылося колькі разоў, і жанчына раптам усьвядоміла: пачаліся хоць якія паўторы – значыць, не адбываецца непапраўнае, тое, што ня мае працягу...

Марыля асьмелілася, ёй зноў захацелася паглядзець на кропельніцу. Яна павярнула галаву, і ў гэты момант пакрысе прыадчыніліся дзьверы, у пакой бачком увайшла медсястра. Так нясьмела і вінавата вяртаюцца дамоў падлеткі пасьля першых запозьненых гуляў.

– Ой, прабачце, прабачце мне, спадарыня Марыля, – пачала яна з парогу. – Столькі ўсяго неадкладнага набегла... Але я не апраўдваюся, вінаватая да сораму. Няма мне даравання, – зьвінела званочкам устрывожаная сястрыца і парадкавала кропельніцу.

Як толькі яна спрытна выцягнула з рукі іголку, Марыля не ўстрымалася і залілася сьлязьмі, моўчкі, толькі па-дзіцячаму часта ўздрыгвалі плечукі.

– Вы з-за мяне гэта, спадарыня Марыля? Каб жа я ведала, каб толькі ведала, што вы такая чульлівая... Усё б кінула-рынула ды падбегам сюды... Падбегам...

– Я ледзьве не памёрла... – скрозь сьлёзы прамовіла зьнядужаная жанчына.

– Чаму так?

– Лекі ўжо сышлі і пачалі ўсмоктваць за сабой паветра, колькі там ужо

заставалася... – запальчыва прамовіла Марыля ды паглядзела на маладзіцу.

...І ўбачыла на яе твары лёгкую, хоць трохі і вінаватую ўсьмешку.

– Авохці мне, спадарыня Марыля, авохці... Вы проста даўно не лекаваліся, і дзякаваць Богу... Цяпер такіх кропельніцаў і блізка нямашака. Сучасныя: лекі адкапалі – і ўсё блакуецца. А я думала... Нішто, нішто вам не пагражала. Але ўсё адно даруйце за перажываньні! Авохці...

І медсястрыца, мусіць, у знак прымірэньня пагладзіла Марылю па плечуку. І папрасіла яе паляжаць у пакойчыку крыху больш звычайнага, каб кроўка ўсхваляваная сунялася, думкі прыкрыя з галавы сышлі, прапалі, згінулі. Пры гэтым медычка ўзялася рабіць сваё – абладжваць новую кропельніцу, парадкаваць у пакойчыку. Трохі супакоеная Марыля міжволі пачала назіраць за яе спрытнымі рухамі. А калі маладзічка дастала аднекуль нібы наўмысна падрыхтаваныя слоік, аркушык паперы і пачала залучаць у шкляное нутро чмяля, дык і зусім замілавалася.

Жамярына, як толькі адчула сьвежае паветра ў форткавай прагаліне, прывітальна зумкнула, усё адно як падала сігнал: не нудзіцеся ў пакоі, гайда за мной, на сонечныя разлогі!

Але Марыля і без таго пачала ўжо зьбірацца. Цёпла, без якой-кольвечы крыўды, наадварот, нібы са сваёй выратавальніцай, разьвіталася з сястрыцай і пайшла. Толькі не да ліфту, а па лесьвіцы – зусім ня вабіла людская мітусьня. Хацелася больш поўна адчуць незвычайна дараваную волю. Яна вырашыла нават да Міколы не заходзіць, хоць трохі і сумнявалася: ці правільна гэта? Менавіта ж сустрэчы-разьвітаньні-сустрэчы з любым Міколкам скрозь, паўсюль, нават у медычным затулку пацьвярджаюць, сьведчаць, што жыцьцё віруе, доўжыцца і, здаецца, будзе вечным. Можа быць... Магчыма... Але Марыля ўжо не змагла ці ня здужала вярнуцца.

На вуліцы ў яе закружылася галава. Нібы пасьля добрай чарчыны любімага чырвонага віна. І гэта было прыемна. У знаёмым да драбніцаў скверыку туды-сюды снаўдалі людзі і ў сваёй разнастайнасьці ўсё адно здаваліся такімі змушанымі адной і той жа мэтай. Праўда, цяпер для Марылі яны былі куды менш цікавымі: так, сьведкі дужа і дужа агульнага. Жанчына збочыла на зусім зьніцелую сьцежку і напрасткі пакрочыла да бліжэйшай вуліцы, на якой густа мясьціліся прыватныя дамы.

«І чаму я такая невыпраўная фаталістка? – думала яна па дарозе. – Як быццам усё мне наканавана ад нараджэньня ці запісана ў радаводнай кнізе...»

Марыліны думкі раптам перапыніў дзіцячы плач, і яна зьвярнула ўвагу на маленькага хлопчыка, які, неслух, вырываўся з матчынай рукі.

– І куды ж ты так імкнешся, упарцік? Відаць, да сябрукоў сваіх, не нагуляўся яшчэ? Але ж і маму трэба слухацца, – замілаваная жанчына са згоды прыязнай маці пачаставала мальца цукеркамі, якімі забылася надзяліць медычную сястрыцу.

«А можа, і добра, што я ня ўпарчуся лёсу? Як Бог дасьць, так яно й будзе... А ён жа, мусіць, бачыць неахаванасьць душы, ейную слабую абалонку, дык і падсабляе – то чалавека добрага скіруе ў мой бок, то абставінамі паспрыяе... Значыць, душа мая яму яшчэ заўгодная...» – раптам суцешліва падумала Марыля.

Тым часам яна ўжо выйшла на гаманкую, вірлівую людской мітусьнёй

вуліцу. Марылін дом быў непадалёку, але цяпер, як ні дзіўна, ёй захацелася хоць трошкі далучыцца да людской заўсёднасьці. І жанчына зайшла ў бліжэйшае кафэ і замовіла сабе добрую чарчыну таго самага любімага чырвонага віна. Яна і думаць забылася, што напой можа зусім неспрыяльна ўзьвіхурыць у крыві яшчэ ня ўсвоеныя лекі. Так прагна захацелася, каб ад жыцьцёвай радасьці звыкла і запамінальна закружылася галава.

## ГАННАМАРЫЛЯАДЭЛЯ

Да трох гадоў Ганулька гадавалася ў бабулі з дзедам. Матулі трэба было неадкладна выйсьці на працу, ад гэтага залежала атрыманьне ў Віцебску кватэры, дык так і зладзілася.

На другім годзе жыцьця Ганулька цяжка занядужыла. Амаль не было веры што выжыве. Бабуля Прося чытала над ёю малітвы, дзед Антось зрабіў на сваім варштаце маленькую труну. Ён, вязень сталінскага раскулачваньня, прывык даваць малую цану жыцьцю. Але Бог палічыў, што дрэва для Ганны яшчэ ня вырасла.

За хатай Антося і Проскі цякла Каспля, а за ёй, на тым беразе жылі сякі – нібыта і нашае, а ўсё ж прыкметна інакшае племя. Дык і межаваліся з ім.

Сякоў было сьмешна слухаць: замест “ч” яны зазвычай прамаўлялі “ц”. Каб быць мудрэй ад іншых, ці што?.. Ня скажуць “саганок”, а “цаганок” – здагадвайся. Не “начоўкі”, “ночвы”, а “нацоўкі”, “ноцвы”. Ня “чапля”, а “цапля”. Прыкрасьць.

У сякоў ня надта ладзіліся гаспадарчыя справы. Але ж вядома чаму. Бывае, едзеш у чэрвені паўз іхнюю вёску, глядзіш: баба ў гародзе канюшыну косіць, а мужык пад яблыняй ляжыць. Дзіва што нашых дзевак так не хацелі аддаваць за сякоў. Калі ішла каторая за рэчку, дык ужо зусім лядашчая, змаркочаная і непрыхільная. Сякоў-мужчынаў нашыя бабы не любілі ня толькі за гультайства, але і за цыганную мітуслівасьць. Ім карцела і карцела зрушыцца з месца, вабіў усход, зманлівасьць небасхілу. Але іншым разам іх закручвала і назад, у наш бок, падзівіцца на сталае жыцьцё – спакусы ж узрушваюць з донца душы сьвярблівую хоць. Тутэйшыя беларусы мелі з гэтага раздражненьне, якое пакрысе пераходзіла ў фанабэрыю. Мусіць, менавіта тутацька адно месца на працяглым памежжы, дзе мы адчуваем сябе выбранымі, узвышанымі, як габрэі. Але ці ўсьвядоміла гэта з цягам жыцьця Ануля – невядома.

Аднойчы яна гуляла каля хаты ў пяску, які дзед прасеяў дзеля рамонту падмурку. І так патрапіла, што праз вёску якраз ішлі сякі, набівальшчыкі фарбаваных кілімаў – ружовых, зялёных, з нязнанымі бухматымі буйнымі кветкамі. І ўбачылі яны малую Ганульку. Адна жвавая жанчына, згадаўшы сваё, пакінутае дома дзіцё, пачала лашчыцца да яе:

– Ай, якая дзевачка, якая харошанькая, якая красавіца. Красавіца, пісаная красавіца...

А гэта пачула бабуля Прося, якая назірала за прышлымі з-за вугла хаты і ладзілася адмовіць на іхнюю прапанову “напэцкаць” яшчэ адзін кілім – ужо былі завешаныя ўсе сьцены.

Увечары, пасьля таго як унучка ўсьлед за бабцяй прашаптала малітву, Прося пагладзіла яе па галоўцы, прамаўляючы: “Красавіца ты наша, красавіца, салодкага сну табе”. Так і прыліпла да Ганулі прынесенае слоўца.

Бывала, вясковыя бабы, чые сэрцы напаўняла мацярынская любасьць, запыняць Антосеву ўнучку на вуліцы, прыцісynуць да грудзей ды трошкі насьмешліва, бо ведалі, што адкажа, пытаюцца:

– Дзевачка, чыя ты, як цябе завуць?

– К'ясавіца! – адказвала сур'ёзная, азораная сінечай вочак Гануля.

Яна сапраўды была прыгажуняй: роўны насок, спрытныя вусенкі, выразныя згібы маленькага цельца ўжо ў жыцьцёвым раньні абяцалі ёй шчодрую прыхільнасьць кавалераў. Іх сапраўды будзе шмат, але закахацца “бяз памяці”, да самазабыцьця, Ганна зможа толькі на чацьвёртым дзесяцігоддзі. І тады сапраўды паверыць, што можа быць “к'ясавіцай”.

У пару сваёй сталасьці жанчына зразумела, што ейны сьветапогляд усё яшчэ мае непашкамутаны, непадзёрты зорны падбой маленства.

На ўсё жыцьцё ёй запомнілася, як дзед Антось павучаў свайго старэйшага ўнука, стрыечнага брата Ганулі Зьмітрака. Той парой ім было адпаведна восем і чатырнаццаць гадкоў. Яны толькі пачалі бавіць у дзеда з бабай школьныя канікулы. Толькі закіпаў зялёнай бухматасьцю чэрвень. Антось быў надта загружаны гаспадарчымі справамі. Перакруціцца ў хаце, глыне вады – і зноў на вуліцу... Але пры тым заўсёды строга аглядваў унукаў і цьвёрда, даволі зычна прамаўляў толькі адно слова: “Работаць!” – і пры гэтым запыняў позірк на Зьмітраку.

Унукі ўзьнімаліся з крэслаў. Хлопчык браўся за коску, сьпецыяльна для яго абладжаную сямёрачку, ішоў доўжыць свой бясконцы вучнёўскі пракос ды з кожным узмахам не забываць націскаць “на пятку”, а Гануля схілялася над чарговай лешкай. Тым летам яна перапалола, лічы, усё бабуліна “барышное”, апроч хіба што морквы. І, як ні дзіўна, на ўсё жыцьцё калі не палюбіла, дык з пакорай прыняла душой гэтую панылую агародную работу.

Калі ў сталыя гады час змусіў Ганну пацьвердзіць сваю самавітасьць праз падабенства з чалавечай бальшынёй, яна нарэшце купіла лецішча ў бліжняй ад гораду вёсцы. Дык у яе быў самы чысты агарод у акрузе – ані табе асоціны, ані купкі макрыцы ці лебяды. Толькі пасеянае ды пасаджанае! Але сеяла і садзіла Гануля не сама, а заўсёды прасіла на падмогу цётку Фрузу. Ёй жа ў сваю чаргу дапамагала палоць лехі ды гранкі.

***

Хлопец і дзяўчына ішлі глухой узьбярэжнай вуліцай. У павуціне галінаў гайдалася жоўтае сьвятло ліхтароў. І цені людскіх постацяў былі рабаціністыя, някідкія. Яны ссунуліся ў гурт. Хлопец не чакаў, што так раптоўна апынецца ў аблозе.

– На нашае зуб загарэўся, паласавацца захацелася... Наўрад ці...

Спрытны карапет падкраўся ззаду і рабром далоні ўдарыў юнака пад каленны згіб. Гайданула ўбок.

– Марак, уразвалку ходзіт... Ой ня любім мы гэтага, ой ня любім. Злуемся, б'ём па храпах. Але ты не хвалюйся, не да сьмерці забіваем. Для сьмелых ёсьць прывілеі – выбар. Можам градабоем акучыць, а калі хочаш, адзін на адзін – у дубкі станавіся.

– Адзін на адзін.

– Годна, годна...

Яна стаяла крыху наўзбоч і да драбніцаў ведала ўвесь далейшы сцэнарый. Зараз счубяцца, мардаты Лёнька з суседняга дому, нібы ёмкім дрынам, будзе спрабаваць падкасіць небараку сваёй доўгай нагой ці,

калі патрапіцца, а зазвычай так і атрымлівалася, гнянуць ёю сьмелага незнаёмца ў далікатнае прамежжа. І тады заляцанец мякка асядзе долу з глухім стогнам. І калі хутка не ачомаецца ці пачне прасіць літасьці, гаспадары вуліцы завядуць з ім звыклую зьдзеклівую гамонку.

– А ты не баец, не баец! Такім мы сваіх краляў не давяраем.

– Пачакай, браце, – адзавецца хто-небудзь, – прывілеі ж у нас шырокія. Можа, чалавек проста сьпешчаны, смаркач, адным словам. І пры тым сасьпелы. Нікога ня трэба пазбаўляць шанцу...

– Што, вось так задарма даць шанец? Не, я ня згодны! Пяць бутэлек “Санцадару” і пяць шакаладак, – адзываўся яшчэ адзін смаркач. І праз паўзу-зацяжку: – Ну, няхай сабе, тры... Мы ж добрыя.

Калі хлопец хутка ўздымаўся на ногі, а, галоўнае, зноў разджагерваўся, станавіўся ў дубкі, паказваў свой абайніты характар, дык мясцовыя “каралі” маглі і саступіць, літасьціва дазволіць праводзіць сваю “каралеву” да пад’езду. Вядома, калі на тое была ейная маўклівая згода.

Яна ніколі не папярэджвала свайго чарговага кавалера, што іх абавязкова пярэймуць у ціхім завулку. Ёй было надта цікава, як ён сябе паставіць, які зробіць выбар, збаіцца ці не. А ў выніку – за каго яе мае, якія ў яго намеры, ці ўзапраўду хлапечае сэрцайка зрушылася ў бок слабой скабіны. А хлопцы-задзіранцы былі ж амаль усе знаёмыя і чынілі свае забаўкі як бы з маўклівай дамоўленасьці са сваёй “каралевай”. Станавіліся своеасаблівымі экзаменатарамі. Дзяўчыне ніколі не прыйшла ў галаву думка, што яна нагадвае чубатую цяцёрку, якая зацікаўлена пазірае на бой маладых пеўнікаў. Праз шмат гадоў пра гэта ёй сказаў адзін кінарэжысёр, які нават прапаноўваў ёй зьняцца ў сваім новым фільме, пажыць у Ленінградзе. Захопленая ягоным вясёлым норавам жанчына, было, нават спакусьліва пажадала, каб ягонае сэрца пахінулася ў бок слабой скабіны. Яна думала, што сэрца падобнае на ківач, які вяртаецца ў захапляльную вышыню разьняволеньня і разам з тым скутасьці неадпрэчнага пачатку новага адліку. А сэрца – як тая рака, у якую ўваходзяць.

***

Калі Ганулька была ў дзясятым класе, аднойчы зімой да яе ў школу прыехаў дзед Антось. Нават да ейнай маці не заходзіў, з аўтобусу – і наўпрост. У мяккіх, акуратна абшытых валёнках, у доўгім, шырокім, падперазаным спрытнай дзяжкай кажуху, з шапкай у руцэ, Антось ішоў па гулкім калідоры школы, як па сваім даўнейшым таку: з прыемнасьцю азіраючыся па баках, нібыта яго мог усьцешыць важкі снаповы набытак. Гаманлівая дзятва не зважала на яго. Пакуль да дзеда не прыхінулася, не прытуліла голаў унучка, трохі ўзрушаная Гануля.

– Добра, добра, потым, – прыгарнуў яе рукой амаль не спыняючы хады бадзёры дзед. Ён ішоў наўпрост у настаўніцкі пакой. Перад дзьвярыма Антось, як звычайна, выцер ногі, балазе ляжаў нявялічкі кілімчык, пагрукаў і тут жа ўвайшоў. Зычна павітаўся і запытаўся ва ўсіх адразу:

– Ну, як тут мая ўнучка, ці стараецца?

Зьбянтэжаныя настаўнікі, калі высьветлілі што да чаго, абступілі дзеда і пачалі нахвальваць Ганульку. Антось ледзьве стрымліваў задаволеную ўсьмешку. А на завяршэньне папрасіў адпусьціць унучку з урокаў, бо адвячоркам яму вяртацца ў вёску, гаспадарку надоўга без нагляду не пак-

інеш, а так хочацца пабыць з гарэзьніцай. Настаўнікі не пярэчылі: гэта ж ня троечніца якая, нагоніць у вучобе.

Яны ішлі па вуліцы і Ганулька шчасьліва радавалася дзеду. Які ён у яе непаўторны, дужы і такі родны. Дзяўчына зусім не саромелася, як гэта бывае ў юнацтве, што дзядуля не такі, як усе, а нязвыкла інакшы – і ў адзеньні, і ў паставе, і ў хадзе – таму што толькі ейны і больш нічый. Ганьне дужа хацелася, каб дзед заўважыў, зьвярнуў увагу на шчасьлівую, сонечную ўсьмешку, якой сьвеціцца ейны тварык. Гэта было ўсё адно, што паглядзецца ў люстэрка.

Але Антось звяртаў увагу хіба што на машыны на пераходах. Нягледзячы на гарадскую сумятню, яму хацелася затрымаць прыемнае пачуцьцё ад наведваньня школы, якое сугрэўнай коткай ужо зьвілося ў ягонай душы. Безумоўна, дзед ведаў, што ўнучка не абдзеленая розумам, вучыцца спраўна, ды яшчэ сьпявае ў школьным хоры, яле яму трэба было падкрэсьліць, што Ганулька – менавіта ягоная ўнучка, што ён з настаўнікамі, усёй дзяржавай заадно ў гадаваньні ды родавым узвышэньні гэтага ўзроставага зьвяна ў ланцужку пакаленьняў. Так Антось, няхай сабе трохі і ўзвышана, думаў таму, што яго аніяк не пакідала крыўда за спляжаныя, нібы векавыя сосны на сталінскіх дзялянках, маладыя гады. У адрозьненьне ад дзяржавы, ён прагнуў прымірэньня.

Ганулька ведала, што яны, як ужо бывала, ідуць частавацца ў кафэ дзіцячых прысмакаў, якое мясьцілася за колькі трамвайных прыпынкаў ад школы. Але не прапаноўвала дзядулю пад’ехаць, бо, як і многія вяскоўцы, ён любіў “мераць” горад пешкі. Адно што ёй трэба было, дык гэта не адставаць. А значыць, прыкметна высільвацца. Антось крочыў шпарка, толькі ў такт крокаў расхінаўся цяжкі кажух. Ганульцы раптам захацелася, каб дзед узяў яе за руку, нібы маленькую, “на прычэп”, але яна пасаромелася гэтага жаданьня. І, дарэчы, згадала расповед бабці.

Было гэта глыбокай восеньню 1930 году. З Суроўлі па Антося прыехаў узброены, пры форме малады вершнік ды загадаў сьпешна зьбірацца, бо “па ягонай справе” з вобласьці прыехаў высокі ўпаўнаважаны чын. Маўляў, было як-небудзь ладзіць з беднатой, дык ня так зайздросьцілі б заможнасьці, не сігналізавалі б “уласьці” пра адчужаных ад яе куркулёў. Хлопец быў трохі знаёмы як сваяк даўняга сябра, гандляра дровамі з Віцебску. Але гэты скупы намёк быў адзіным знакам прыязнасьці з ягонага боку. У астатнім, асабліва на людзях, малады службовец паводзіў сябе надта строга. Прысьпешваў Антося, калі той пераабуваўся ў высокія хромавыя боты ды зьбіраў з Просяй хатулёк самага неабходнага ў дарогу, са злосьцю пакрыкваў на вуліцы, калі разгублены гаспадар няўклюдна і доўга зачыняў весьнічкі.

Да Суроўлі набягала кіламетраў шаснаццаць, і Антосю трэба было пачасту подбегам пасьпяваць за жвавым каньком па раскіслай у нізінках палявой дарозе. Гаспадар пашкадаваў, што ліпучую чорна-шызую гразюку даводзіцца мясіць найлепшымі, так спрытна сшытымі ботамі. Суцяшаў сябе хіба што разуменьнем неадпрэчнай неабходнасьці: хоць і не па сваёй волі, але ж у людзі йдзе, і ў прыкрых прытулках трэба выглядаць годна...

На паўдарозе Антось пачаў прыкметна стамляцца і ўсё больш і больш намагацца не здрабніць крок. Вершнік раз-пораз азіраўся, а потым дастаў аднекуль скручаную ў жмуток вяровачку, прыладзіў яе да сядла ды кінуў завязаны буйным вузлом канец Антосю: маўляў, чапляйся на буксір. Але

заможны гаспадар ня ўважыў гэта за ласку, а хутчэй за абразу – як таго бычка на бойню павалачэ – і адкінуў вяроўку ў калужыну.

***

Гануля трымала ў сваім абшчэпе Марыліну далоньку так далікатненька, нібы мяккага верабейчыка са свайго касплянскага дзяцінства. І ў той жа час яна абмацвала кожны пальчык унучкі, усе мяккія падушачкі ды дробныя костачкі дзіцячай ручкі. І дзівілася: як яна, гэтая ручка, сваімі абрысамі падобная на ейную – такая ж шырочанькая і па-сялянску цяжкаватая, налітая, як пшанічны колас. Ганулі раптам здалося, што гэта яна сябе вядзе першы раз у школу праз такое вялікае ляда часу. Нахлынула дзіўнае адчуваньне заблытанасьці чаргаваньня пачатку і доўгага працягу, і зноў пачатку, нанова, потым завяршэньня, а тады ўсё ж працягу. Яшчэ і таму, што за колькі крокаў ззаду за імі ішлі сын з нявесткай (тата з маці) і ціха размаўлялі пра сваё. Нібы зусім адпрэчаныя ад гэтай сьвітальнай падзеі. Насамрэч яны проста цешыліся са сваіх родненькіх, з такіх падобных адна на адну зграбнасьцю постацяў, і адчувалі самую моцную ў жыцьці повязь. Гануля здагадвалася пра іх пачуцьці і адчувала сябе шчасьлівай. Яна прыехала да сына ранічкай і далучылася да ўпрыгожваньня Марылькі. Ёй даручылі самае адказнае – заплесьці дзяўчынку і ўвершыць ейную макушку вялізным шыкоўным бантам, бялюткім, з ледзь прыкметным блакітным адлівам. І вось цяпер Ганне здавалася, што яна злучана рукою з кавалачкам неба, лёгкай аблачынкай, напоўненай плыткімі марамі.

Было хораша, па-сапраўднаму сьвяточна на душы. І здавалася, ня будзе сканчэньня гэтай праясьненасьці. Бацькі дазволілі бабці і ўнучцы пасьля школьнай урачыстасьці пабыць удвух – паласавацца ў дзіцячым кафэ, схадзіць у царкву на абедню, пагуляць па набярэжнай.

Гануля дужа любіла душэўную зьнітаванасьць з унучкай менавіта ў атачэньні царкоўных сьценаў пад высознымі, з нябеснымі выгінамі скляпеньнямі. Перад царквой яна ніколі ня брала Марыльку за ручку, каб пры ўваходзе дзяўчынка магла вольна, нязмушана перахрысьціцца ды пакланіцца высокаму прытулку. У такія моманты Ганне заўсёды згадвалася сваё маленства, калі яна, мусіць, на пятым годзіку жыцьця ад бабці з дзедам пераехала на сталае жыцьцё ў горад, у такія нязвычныя, без іконак і рушнікоў у чырвоным куце сьцены. Прыгнечвала прыкрасьць, калі садзіліся за стол, бо ні маці, ні бацька не хрысьціліся, як гэта было заведзена ў вёсцы, а толькі жадалі адно аднаму “смачна есьці” ды падсоўвалі ўпадабаныя стравы. Спачатку Ганулька прыдумвала нагоду і хуценька сыходзіла ў другі пакой ды там таропка шаптала малітвачку і хрысьцілася. Бывала, не разумеючы што да чаго, яе клікалі і дзяўчынка саромелася, нібы ўпільнаваная ў якой шкодзе. Неўпрыкмет яна пачала ўсё радзей і радзей брацца за сваё няхітрае набажэнства, а з цягам часу і наогул забылася на яго.

...Як заўсёды хораша, кранальна сьпяваў царкоўны хор. А людзей было прыкметна больш, чым у будзённыя дні. Гануля прыкмеціла колькі такіх, як яна, бабуль з унукамі і ўнучкамі і адчула прыемнасьць ад гэтай шчодрай супольнасьці. Яна наогул была ў царкве ўважлівая да самых дробных дэталяў, нібы сьпецыяльна назірала.

Калі яны ставілі сьвечкі, а вёрткая Марылька рабіла гэта першай, Ганна

заўважыла, што ўнучка выбрала гнязьдзечка ў вышнім крузе і, каб дастаць, стала на дыбачкі, выструнілася, узьняла ўгору руку... І гэта было такое кранальнае памкненьне, што Ғануля шэптам папрасіла Божага спрыяньня, каб Марылька вось так натхнёна высільвалася і ў школьнай вучобе. І яшчэ адно назіраньне не пакінула без увагі шчасьлівая бабця. Раптам яна заўважыла, што падчас казаньня сьвятара Марылька ня столькі ўслухвалася ў ягоныя словы, колькі азіралася па баках, адыходзіла ды штосьці выцікоўвала ў куце храма. Хутка Ганна прыкмеціла, што ўнучка адшуквае ў натоўпе сваіх роўналеткаў, нібы хоча з кожным павітацца і засьведчыць: бачыце – і я тут, мы ўсе разам. З асаблівай ахвотай колькі разоў яна падыходзіла да купкі людзей, у якой стаяў з маці бялявы, з вяргінямі ў руцэ хлопчык.

***

Стомленая, яна зноў не магла заснуць, ды і наўмысна не засынала першай, усё адно як гэта было б сьвядомым адчужэньнем ад ягонага дыханьня, якое вабіла слухаць і слухаць колькі жыцьцяў запар. Прыхінуцца да жаданага цельца грудзьмі, нізам жывата – шчыльна, шчыльна і ўсёй сваёй істотай чуць, як ад зацішэньня да зацішэньня вагаецца ўвесь сьвет, уся ягоная атмасферная абалонка. Гэта была бясконцая надзея знітавацца з адзіным на цэлае імгненьне паміж удыхам і выдыхам. Паміж растаньнем і сустрэчай, якія таксама чаргаваліся ў жыцьцядайным рытме.

І пры тым ягоныя наезды ўсё ж былі нечакана-непрадказальнымі – непаўторнымі. І было няўцямна: як жа тады ствараецца гэтая сусьветная пульсацыя, такая простая і такая таемная.

Здаралася, ягонае дыханьне раптам запавольвалася, удыхі рабіліся куды больш глыбокімі, нібыта ён наўмысна затрымліваў паветра ў лёгкіх... Нібыта баяўся і ў сьне ўпудзіць мятліка на лісьцінцы ранішняй мелісы. І тады прамежак паміж уздыхам і выдыхам доўжыўся не адно імгненьне, а два ці нават тры, і адпаведна дужэла ейная надзея быць з ім яшчэ і яшчэ ў абдоймах супольнай адзіноты. Няхай сабе і ў засені сьмерці, бо ў такія моманты яна дранцьвела і ад трывогі, што ён раптам ня зробіць наступны ўдых і адрыне працяг. Пачынала шкамутаць яго за руку, цалаваць у шчокі, скроні, лоб, будзіць, будзіць... А калі каханы прачынаўся і ня мог усьвядоміць, дзе ён, а з гэтага і запавольваўся ў выяўленьні сваёй радасьці, яна раптам адчувала сябе яшчэ больш шчасьлівай, бо спыняўся час. Яна паглынала яго абдымкамі, закалыхвала ўлоньнем, а ў самы шчыльны момант блізкасьці, калі душы яднаюцца ня менш, чым целы, магла заплакаць бяз сьлёз і засьмяяцца бяз выгуку...

Звычайнае вар'яцтва каханьня.

***

Ғануля і Марылька вярталіся дадому пешкі, сваімі гарадскімі, да драбніцаў зьведанамі сьцежкамі. Ад царквы – па ўтравелым узьбярэжжу Дзьвіны і ўгору – па прыступках, якія ўзьнімалі да клеткі з рыклівым такой парой састарэлым ільвом Кінгам, аддадзеным на пацеху гараджанам землякомцыркачом. Потым каля помніка Леніну праз невялічкі скверык, наўпрост да пад'езду. Ганна трохі шкадавала, што ім аніяк не абмінуць помнік рэвалюцыйнаму завадатару. Калі Марыльцы было гады чатыры і яны ўпершыню ішлі такой дарогай з царквы да хаты, дзяўчынка запыталася: "А хто гэты дзядзя?" "Гэты дзядзя сваім сьвярблівым пальцам, які ўзьнімае перад на-

тоўпам, выкалаў нашаму дзядульку вочка...” – нечакана для сябе вымысьліла страшную гісторыю Ганна. Ды яшчэ нагадала маленькай пра партрэт іхняга незабыўнага Антося, зроблены са старой фотакарткі колькі гадоў таму, адразу пасьля сьмерці старога. Марылька дужа спужалася, учапілася ў спадніцу, прытулілася да бабчыных ног, нікуды не хацела далей ісьці. Ганулю абшчапіла яе і адчула, як па маленькай сьпінцы прабегла хваля дрыжыкаў. Сумелася, разгубілася: ці ня надта напужала сваю крывіначку, але хутка і супакоілася – інакш нельга, павінна на ўсё жыцьцё запомніць, якой болькай стала для іхняга роду рэвалюцыйная калатуха. Але праз месяц-другі, у лістападзе, Ганна зразумела, як небясьпечна лёгка прышчапляецца чаранок нянавісьці і да такога хісткага саджанца. Калі яны зноў ішлі каля помніка, Марылька ўбачыла прынесеныя да яго ўзножжа вяночак і колькі чырвоных гвазьдзікоў. “Бабуля, а давай парвём іх”. “Што ты, красачка, нельга. Ёсьць жа людзі, якіх гэты завадатар узвысіў на такую ж прыступку, як сам стаіць. Яны яго шануюць, любяць. А мы ж людзі выхаваныя, павінны ўсіх людзей прызнаваць, да аднаго чалавечка...” Ганулю прамаўляла гэтыя словы з патаемнай усьмешкай у куточках вуснаў. Па сутнасьці, яна была ўсьцешаная Марыльчынымі пачуцьцямі, толькі, вядома ж, не магла падтрымаць іх.

У год першых школьных канікулаў Марылькі Ганулю ўзяла на рабоце адпачынак раней звычайнага, каб паехаць з ёю на Касплю, пажыць разам у старой дзедаўскай хаце і такім чынам як бы надтачыць сваё дзядзінства ейным, такім суладным, нібы працяг.

Але наперад, напачатку чэрвеня, да Ганулі прыехаў даўні сябра – Алекса Карабец з Украіны. Постмадэрніст, традыцыйны ў выяўленьні шчодрай прыхільнасьці да жанчын. Алекса пагасьцяваў пару тыдняў і ўсе гэтыя дні блукаў па Віцебску магчымымі сьцяжынкамі славутага Шагала – пісаў пра яго аб’ёмную кнігу, пачатую яшчэ пры жыцьці майстра, пасьля сустрэчы з ім ў Сэн-Поль-дэ-Вансе. Украінскі сябра кружляў па ўзьнёсламу гораду падручкі з Гануляй. Іншым разам, згадваючы былое, ім карцела нават, як тым закаханым са славутай карціны, узьняцца ў блакіт летуценьняў, але ж і ў яго, усё адно, як у тую раку, два разы ня ўвойдзеш. Да таго ж раз-пораз да іх “прышпільваўся” хвасток – гарэзьніца Марылька, якой так карцела пагуляць разам са сьмешным вусатым дзядзькам.

Больш таго, на другі раз яна прынесла паказаць знаўцу мастацтва свае малюнкі, а потым, калі раззнаёміліся, украдліва папрасіла Ганулю замовіць слова, каб дзядзька Алекса напісаў і пра яе кніжку. А пісьменьнік якраз жа ўпадабаў і малюнкі, і саму Марыльку ды ейныя разважаньні пра жыцьцё. Дык і паабяцаў напісаць яшчэ адну кніжку, толькі не такую тоўстую, як пра дзеда Марка. Марылька пачала чакаць. З нецярплівасьцю. А калі Алекса нечакана зьехаў, пакрыўджаная, замурзэленая Марыля з гарачай злосьцю выдыхнула бабці:

– Ну і няхай сабе ня піша, нават танюткую. Я сама напішу, у кардонавых вокладках і з малюнкамі. Сама! І музыку якую прыдумаю. Усё, усё зраблю... Ня трэба мне ягоных абяцаньняў.

Ганулю ледзь стрымала ўсьмешку.

– Сама, сама... Ты ж у мяне разумніца. Паедзем у вёску і там напішам кніжачку. Спачатку пачытаем, павучымся, а потым напішам. Разумніца мая..., – каб трохі перабіць настрой, пашкуматала, паказытала дзяўчынку Ганулю.

А сама міжволі задумалася: “Як яна ўсё ж-такі падобная на мяне. Бывае,

і прадоньне ва ўзросьце не заўважаеш. Вось толькі што гаварылі з Алексам пра найвялікшы грэх – пустое славалюбства ды пыхлівую фанабэрыю людзей. Яно ж усё бязмежнае, нібы сусьвет. Выходзіць, ня толькі на чалавека прымеранае, але і на Усёмагутнага Творцу. Дык куды ўжо большае грахаводства! Некуды. Алекса, а яму ж без малога ўжо шэсцьдзесят, прызнаўся, што зусім нядаўна даўмеў: і жанчыны такія ж славалюбныя, фанабэрыстыя, як і мужчыны. Ганарліўкі! Кожная – няспраўджаная каралеўна... А калі спраўджаная – дык што і казаць. Мужчыны надзімаюцца, выпруджваюцца, становяцца на дыбачкі, асабліва ў творчасці, каб прымерацца да Ягонай Непаўторнасьці, а жанчыны ў сваю чаргу – да неўтаймоўнасьці мужчынскага валадарства, асабліва ў каханьні. І почасту падсьвядома, ці наперад, як Марылечка, такі зялёны, такі родны зародак жаноцкасьці...”

Ганула згадала, як аднойчы ў гаманкой кампаніі, у якой узьнімаў чаркі і ён, новы ейны прыхільнік, па няпісанай завядзёнцы паміж імі распачалася зацятая пікіроўка, дыспут ня дыспут, але прыкметнае несуладдзе сьветапоглядаў. На людзях яна міжволі ці з прыроджанай зацятасьці станавілася ў рожкі з асаблівым імпэтам, неўтаймоўным пачуцьцёвым уздымам. Ёй было цікава, як у тых юнацкіх бойках падчас праверкі кавалера, тут жа далучалася да ягоных незычліўцаў – абы паказаць сваю пыхлівасьць, станавілася на іх бок. Усё адно як з памкненьня пазбавіцца ад душэўнай няўстойлівасьці, якая вынікае са шчодрай блізкасьці з ім, калі ў енку асалоды чуйнае вуха ловіць і рэха сьмерці. Ганула са свайго і, мусіць, з досьведу ўсіх папярэдніх сваіх бабуль, цётак, сястрычак ведала, што жарсьць пачынаецца з абрыву. І не было аніякага паратунку – ані табе застыць, як камень, затаіцца, ані збочыць у звыкласьць будзённасьці. І нікому пра гэта нельга было расказаць, толькі ўсім. (Не пашаптаць-паспавядацца, а выгукнуць у людской гамане, для многіх вушэй. З цягам часу жанчына зразумела, што гэта аніякая ня спроба задубіць душу перад казытлівай мяккасьцю інтымнасьці, а, наадварот, толькі падкрэсьліць вастрыню адчаю страціць яе).

І толькі яны абое, і то больш яна, чым ён, ведалі ці здагадваліся пра сапраўдную мэту і правілы гэтай гульні.

Аднойчы падчас такіх неабавязковых, але немінучых размоваў Ганула сказала: “Калі б мне выпала яшчэ раз пражыць свой век, я да драбніцаў усё паўтарыла б! Да драбніцаў”.

І гэта таксама быў чарговы выклік, праява ўсё той жа пыхлівасьці, фанабэрыі, а яшчэ прытоены адчай адцураньня – маўляў, і тыя, што пачаргаваліся да цябе, былі б і зноў, паўтарыліся б – мая годнасьць бездакорная! Так выяўляецца прызнаньне абсалюту асалоды, у якой няма лепшых ці горшых варыянтаў. Толькі перажыць зноўку.

***

У першы адвячорак, як толькі Ганула з Марыляй прыехалі ў сваю родавую вёску, яны абышлі з гарадскімі пачастункамі ўсіх суседзяў – прывіталіся, распыталі пра жыцьцё-быцьцё. А потым пайшлі на Касплю, на сваю ўлюбёную пясчаную касу, намытую імклівай левабярэжнай ручаінай. О, якая тут празрыстая на крэмневым пясочку вадзіца! Як мякка кладуцца на гэтую пасьцельку ўнуччыны ступачкі. А вады акурат па лытачку, як і тады, у маленстве Ганны. Нібыта прырода наўмысна прынесла на гэта беражок прывітальную казытлівасьць.

Бабуля з унучкай вырашылі штодзень прыходзіць сюды якраз адвячоркам. Бабцы хацелася лёгкага одуму падчас сузіраньня аскепкаў сонца на хвалях. Марылька ж любіла проста бегаць па водмелі і драбніць тыя сонечныя аскепкі на бурштынавыя пырскі.

Але праз тры дні іхнюю завядзёнку парушыў прыезд Ганулінай пляменьніцы Хрысьціны з немаўляткам Адэлькай, капрызуляй і румзай, але ж і такой любай лялечкай. Новажыхары таксама планавалі прабавіць на касплянскім улоньні колькі тыдняў. Першае, што зрабіла Хрысьціна, дык гэта дастала з гарышча арэхавае крэсельца-трансформер, на якім яшчэ сама Гануля гадавала сваіх Юрася ды Антося, названага ў гонар незабыўнага дзеда.

Маленькае з надзейнымі парэнчынкамі крэсельца ўзвышалася метра на паўтара, што было вельмі зручна пры кармленьні, а калі складвалася – атрымліваўся своеасаблівы вазок з фанерным столікам наперадзе, зручным для забавак з рознымі бразготкамі ды іншымі цацкамі для зусім няўцямных. Цяпер Адэлька зазвычай сядзела на валадарскім узвышку і вакол яе мітусьліва віравалі падданыя – найперш маці, стрыечная бабуля Ганна і прабабуля Гелена, якая, маючы дзявяты дзясятак, усё марыла пра “кулацкі надзел”, які цяпер называўся “фермерская гаспадарка”. Падносілі бутэлечкі з соскамі, а потым торкалі ў роцік падманную гумкавую цмочку. Трэсьлі перад вачыма якой цацкай, абціралі кужальком і проста дзеля пацехі рабілі маленькай “казу рагатую”. І ня ведалі, што ўчыніць яшчэ, каб хоць трошкі здаволіцца пачуцьцём абнаўленьня, якое ў жаночых душах ня мае завяршэньня, а толькі працяг. Іншым разам Гануля лавіла сябе на думцы, што маці ня толькі набліжаная, але і аддзелена ад дзіцёнка гэтымі пачуцьцямі, нібы ў коканы зашытыя праз іх у сваю недакранальную існасьць. Вось як цяпер: Адэлька – кугукае, няўклюдна і няўцямна махае ручкамі, таўчэ, нібы ў ступе збажыну, ножкамі, цягне ў рот кожную драбязу, бо рэжуцца зубкі, а ейныя натхнёныя сардэчнай уцехай дагаджальніцы ўсё імкнуцца ды імкнуцца ўбачыць у гэтых змушаных праявах хоць які водгук на сваю ўсьмешку, пацалуначак, казытлівы дотык. Хоць ледзь прыкметны, нават выпадковы. Толькі адной Марыльцы было ня ў нос гэтае валаводжаньне з малой піскляй. Яшчэ б! Цяпер на яе амаль забыліся, нават ласункі даваць перасталі. А бабця дык і за стол разам, бывае, не садзіцца. Толькі адгаворачкі: “Марылька, налі сабе малачка з бітончыка, пакаштуй з хрушчыкамі, а я Адэльку панашу, на ручкі просіцца...” І Марылі, зьбянтэжанай такой зьдзеклівай прыхільнасьцю да яе, хацелася раптам стаць маленькай-маленькай, яшчэ меншай ад гэтай малюпашкі, ці наогул не нарадзіцца. І тады яна наўмысна, каб прыцягнуць увагу, разьліла малако на стале.

Але больш за ўсё па-свойму гаротная дзяўчынка пакрыўдзілася падчас прыходу суседкі Піліпчыхі, якая ў суботу вечарам прысунулася “на пасядухі”. І, як усе, з той жа салодкай лісьлівасьцю ў голасе пачала лашчыцца да Адэлькі:

– Красачка ты наша... Сонейка шчодрае...

І дзіва – немаўля раптам суцішылася і, здавалася, нават усьміхнулася сваёй пакуль бяззубай, як ужо ў Піліпчыхі ўсьмешкай, замахала ручкамі ды часта загугукала. Марылька ня вытрымала гэтай пацехі і крадком, каб ніхто ня ўбачыў, ушчыкнула “яснае сонейка” за бачок. Не балюча, але дастаткова для роспачы, якая падчас асвойтаньня кволым чалавечкам белага сьвету выяўляецца з надзвычайнай шчодрасьцю. Адэлька зарумзэліла на ўсю хату, з яшчэ нябачаным дагэтуль імпэтам. Суседка, старэйшы сын якой

служыў папом у суседніх Гараватках, сьпешна дастала з кішэні драўлянае, дробна расьпісанае яркімі фарбамі яечка ды выставіла яго на далоні перад Адэлькай, каб прыцягнуць ейную ўвагу ды як-небудзь супакоіць. Яечка, якое сын прывёз маці на Вялікдзень, Піліпчыха якраз і прынесла ў падарунак, але была змушаная вось так нечакана-сьпешна выстаўляць яго на агляд.

– Ой, цётачка, не давайце яго нашай рымзулечцы... У рот жа пацягне. Лепш няхай Марылька з яечкам пагуляе...

І гэта была адна з нямногіх за апошнія два дні згадак імя дзяўчынкі, і то зноў жа ў зьвязе з Адэлькай... У горле Марылі перасеў горкі камяк, яна выбегла з хаты, затачылася ў глухі куточак дрывотні і горка заплакала: “Памру, ня буду жыць. Няхай тады самі паплачуць!”

***

Ён паміраў невыносна цяжка і доўга. Хаця гаварыць пра лёгкую сьмерць, мусіць, гэтак жа недарэчна, як і пра лёгкае нараджэньне. Боль цьвярдзеў у ім жалезным прутом паўсьцяж усяго цела. Час скурчыўся да бясконцай аднастайнасьці. Будучыня стала ўспамінамі, але і на іх ужо прыкметна паменела сілы. Самотніку здавалася, што ён раптам адчуе, як у ягоным целе ідзе абмен рэчываў.

Ён ня мог згадаць аніводнай значнай падзеі, якой можна было б падрахункаваць сваё жыцьцё. Так у звыкласьці працягу немагчыма згадаць які ўдых ці выдых. І тады небарака падумаў: калі і было што вартае ды значнае ў адлушчаным часе, дык, мусіць, толькі каханьне. Яно ніколі не праходзіць дарэшты, як цяпер вось здаецца, ніколі ня пройдзе невыносны боль.

Зьняможаны небарака дзівіўся, што згадкі каханьня амаль зусім ня лучацца з ейным імем, адзіным і непаўторным. Шчыра кажучы, ён ніколі ня верыў, што дзеля глыбокага асэнсаваньня сьвету патрэбна якое-кольвечы суаўтарства, але ж і безназоўная абагуленасьць засмучала, пазбаўляла адчуваньня асабістасьці перажытага. “А, можа, гэта Бацька-Бог перад сваёй высокай брамай пазбаўляе спасылак на каго б там ні было, маўкліва даводзіць, што асабістае – толькі ў Ім”, – падумаў мужчына і ўпершыню забаяўся адзіноты. Цяпер яна магла выявіць толькі ягоную слабасьць, а ня сілу і адметнасьць, як было раней.

Ён ляжаў на старым, зробленым яшчэ прадзедам драўляным ложку. Помнілася, як на ім паміраў бацька, як тады падсаджваўся да яго на ўскраек гэтага ложка і спрабаваў прыдумваць якія трапныя словы, але ўсё адно яны былі неабавязковымі.

“Сьмерць перадаецца ў спадчыну”, – падумаў небарака, і ў яго ўпершыню ўзьнікла жаданьне запісаць гэтыя словы ў свой дзёньнік, як, мусіць, апошнюю зацемку. А яшчэ яму хацелася, хоць і ведаў, што ўжо нямашака сілы нават трымаць яе ў руках, пачытаць колькі старонак Бібліі. Найперш дзеля таго, каб не шкадаваць, што спачатку з-за няўседлівасьці, а потым з-за разгубленасьці не прачытаў столькі непаўторных, азораных сьвітанкавым натхненьнем геніяльных аўтараў кніг, дык вось і напасьледак здаволіўся адной – такой глыбокай, як уздых адчаю.

Ён не памёр ні назаўтра, ні праз тыдзень... Толькі стагнаў і курчыўся ад болю. І здратаваны ім, як восеньскае поле плугамі, было свавольна падумаў, што сьмерці наогул няма, бо ёй ніхто ня даў імя. Дык ніхто і ня згадвае яе, усё адно як ён – Ганулю.

***

Сонца садзілася на хвалі Касплі і сплывала па ёй акурат на захад, каб назаўтра таксама прыплыць, толькі з другога боку. І здавалася, аніўто не выходзіла за межы гэтага спрадвечнага немітусьлівага рытму. А рытму радасьці і журбы нямашака, яны прыходзяць калі заўгодна і ня злучаныя з часам хоць якімі абавязкамі і прадвызначанасьцю, думала Ганупя. Можа і таму жыцьцё чалавека адзіна трапнае і адзіна магчымае ў сваёй наканаванасьці. Было толькі прыкра, аж вусьцішна, што памёр ужо ня першы ейны каханы. Нібы начныя матылі разьбіліся аб гарачае шкло ліхтара-газьніцы. І яна баялася, што гэта паўторыцца яшчэ і стане, крый Божа, марудным, як цячэньне нагрэтай смалы, д'ябальскім рытмам. І тады можа падацца, што сьверб нараджэньня пакінуў жаночае ўлоньне. І гэта будзе адчуваньнем сьмерці.

Аднойчы ўвечары – якраз дрэнчылася, не магла заснуць Адэлька, і Ганупя ўзяла яе на рукі, потым паклікала Марыльку і тая ўчапілася ў бабуліну спадніцу – і так разам, у цёплым счэпе яны выйшлі на касплянскі ўзгорак. Павольная бруя ветрыка прывітальна казытала іх твары. Ганулі раптам захацелася, каб іх хто-небудзь сфатаграфаваў у гэты момант – усё адно як баялася зьнерухомець на курганку назаўсёды, ператварыцца ў закамянелую здань, стаць звыклай прыкметай навакольля, а на фотаздымку – гэта ж на імгненьне ды яшчэ праз такую чалавечую звыкласьць... Ганупя раптам забаялася панаваньня прыроды, ейнай паглынальнай усёабдымнасьці. Ганнамарыляадэля – і кола замкнулася. Час зьвіўся ў клубок. “А надточаць яго, завяжуць новы вузельчык ужо без мяне, без мяне”, – думала жанчына і, дзіўна, ад гэтых думак на душы разьліваўся гаючы спакой.